[11] Гл.: Барвіньский Б. Жигимонт Кейстутович, Великий князь Литовско-русский (1432–1440). Історична монографія. Жовква, 1905. С. 14.
[12] Гл.: Monumenta medii aevi historica. P. 798.
[13] См.: Długosz J. Op. sit. S. 386.
[14] Гл.: Коцебу А. Указ. пр. С. 84.
[15] Гл.: Коцебу А. Там же.
[16] Владимирский летописец. С. 132.
[17] Никифоровская летопись. С. 34.
[18] Супрасльская летопись // Полн. собр. рус. летописей. Летописи Белорусско-Литовские / Отв. ред. акад. Б.А. Рыбаков. М., 1980. Т. 35. С. 57.

Паступіў у рэдакцыю 08.09.2003.

***Андрэй Уладзіміравіч Любы*** – аспірант кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт Ю.Л. Казакоў.

*І.С. КАШТАЛЯН*

## УПЛЫЎ РЭПРЭСІЎНАГА ФАКТАРУ ПАЛІТЫКІ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ НА ШТОДЗЁННАЕ ЖЫЦЦЁ НАСЕЛЬНІЦТВА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1944–1950 гг.)

Анализируется внутриполитическая ситуация, сложившаяся на территории Западной Беларуси в послевоенные годы. Делается вывод о том, что массовый отъезд населения в Польшу и коллективизация привели к ослаблению сопротивления советской власти.

The article analyses the situation at the territory of West Belarus because of the Soviet power arrangements and the activity of anti-Soviet underground. It concludes that mass departure of the population to Poland and collectivization led to the further weakness of the resistance to the Soviet authorities.

Змены савецка-польскай мяжы 1939 г., яе пасляваенная дэмаркацыя значна паўплывалі на лёс жыхароў Заходняй Беларусі. З дамовы, падпісанай паміж урадам БССР і Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення ў Любліне 9 верасня 1944 г., вынікала, што да ПНР адышлі 17 раёнаў Беластоцкай і тры раёны Брэсцкай абласцей БССР (з часткай Белавежскай пушчы агульнай плошчай 14,3 тыс. кв. км, з насельніцтвам у 600–700 тыс. чал.)[1].

У тым жа пагадненні прадугледжвалася добраахвотная эвакуацыя беларусаў з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі БССР у Польшчу (тых, якія былі ў польскім грамадзянстве да 17 верасня 1939 г. і пражывалі ў заходніх абласцях БССР). Гэтая акцыя павінна была працягвацца з 15 кастрычніка 1944 г. па 1 лютага 1945 г.[2]

БССР пачала масавы абмен насельніцтвам у кастрычніку, Польшча – у снежні 1944 г. Адной з асноўных прыкмет вызначэння беларусаў стала рэлігійная – праваслаўнае веравызнанне.

Людзі не спяшаліся выязджаць у Польшчу, бо панавалі чуткі, што пад прыкрыццём пагаднення ўсіх зарэгістраваных на выезд вышлюць на ўсход[3]. Іншым стрымліваючым фактарам было чаканне змянення мяжы, бо значная частка жыхароў Заходняй Беларусі не лічыла яе канчатковай і верыла, што заходнебеларускія землі вернуцца ў склад Польшчы. Армія Краёва (АК) уздзейнічала на мясцовых беларусаў, каб тыя заставаліся на ўласнай зямлі. Многія не хацелі пакідаць абжытых месцаў. Калі межы канчаткова вызначыліся, то і настроі змяніліся.

У 1944–1945 гг. на Беларусі знаходзіліся дывізіі франтавых армій, унутраныя войскі НКУС, якія нярэдка злоўжывалі сваім статусам. Актыўна дзейнічалі вынішчальныя батальёны, брыгады садзейнічання міліцыі, новапрыбыўшыя партыйныя кадры з Усходу. Разам з узнаўленнем органаў дзяржаўнай улады і кіравання пачалі ствараца папраўча-працоўныя ўстановы.

Прадстаўнікам мясцовых і цэнтральных органаў кіравання рэгулярна дакладвалі пра настроі. Пададдзел палітычнага кантролю МДБ правяраў да 80 % асабістых лістоў. Перш за ўсё НКУС цікавілі не калабаранты, а арга-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

нізацыі АК, Арганізацыя Украінскіх Нацыяналістаў – Украінская Паўстанцкая Армія, беларускія нацыяналісты, якія перашкаджалі ўсталяванню так званых "другіх саветаў". Шмат каму з мясцовага насельніцтва не падабалася палітыка Савецкага Саюза (прымусовая калектывізацыя, антырэлігійны ціск, палітычныя рэпрэсіі), таму дзесяткі тысяч мясцовых жыхароў ішлі ў антысавецкае падполле (польскае, украінскае, беларускае, літоўскае).

Асноўным метадам барацьбы супраць падпольных узброеных фарміраванняў стала чэкісцка-вайсковая аперацыя. Многія мясцовыя жыхары станавіліся нявольнымі заложнікамі сітуацыі, бо яны знаходзіліся пад пагрозай фізічнай расправы як з боку органаў бяспекі, так і антысавецкага падполля, пра што сведчаць і прыклады з выбарамі, калі людзі баяліся балаціравацца ў дэпутаты ці нават проста галасаваць[4].

Амаль пра кожнага жыхара Заходняй Беларусі ўлады пазначалі: "Знаходзіўся на акупіраванай тэрыторыі". Такая пастаноўка пытання рабіла "патэнцыяльнымі злачынцамі" ўсіх жыхароў гэтых тэрыторый, да якіх праяўлялася большая пільнасць, арганізоўваліся дадатковыя праверкі органамі НКУС па месцы жыхарства, адкуль маглі адправіць у праверачна-фільтрацыйныя лагеры НКУС на тэрмін ад некалькіх месяцаў да некалькіх гадоў. Новыя кадры для савецкіх органаў прыехалі з Усходу са сфармаванай прадузятасцю да мясцовага насельніцтва – "кулакоў", "ворагаў народа", "шпіёнаў", "дыверсантаў", "тых, хто затаіўся", "фашыстаў", "сіяністаў", "нацыяналістаў" і ўвогуле – да любога чалавека. Такія людзі маглі рэпрэсіраваць за дробязь, да гэтага іх штурхала актыўная дзейнасць на ўказаных тэрыторыях антысавецкага падполля.

Селянін Заходняй Беларусі разглядаў сітуацыю праз прызму страху чакання негатыўных падзей і працэсаў, якія маглі адбіцца непасрэдна на яго жыцці ці на лёсах яго нашчадкаў. Гэта адчуванне мела важную і ў некаторых выпадках нават вызначальную ролю ў настроях асобы і грамадства. Стваральнікамі насцярожанасці з'яўляліся як карныя органы савецкай улады, так і антысавецкае супраціўленне.

Значная частка лрацаздольнага насельніцтва, якую накіроўвалі на прымусовыя работы, не хацела пакідаць радзіму і "дэзерціравала", за што на іх заводзілі крымінальныя справы. Улада, накіроўваючы людзей на працу, мела на мэце дзве задачы: выкарыстаць працоўныя рукі на патрэбных ёй аб'ектах і ідэалагічна апрацаваць беларусаў-заходнікаў, нават зламаць іх маральна.

Звяртае ўвагу вялікая колькасць крымінальных злачынстваў, за якія суды маглі прызначыць вышэйшую меру пакарання (напрыкпад, за большасць контррэвалюцыйных злачынстваў). Шмат артыкулаў (адмова ад выплаты падаткаў, забойства жывёлы і г. д.) прадугледжвалі канфіскацыю маёмасці. Пры пазбаўленні падсудзімага праваў апошні губляў не толькі палітычныя правы, але і права займаць тыя ці іншыя пасады, на пенсію, дапамогу па беспрацоўю, пазбаўлялі яго і бацькоўскіх праваў[5].

Агульная эканамічная сітуацыя характарызавалася затрымкамі зарплаты, высокімі цэнамі, прымусовымі дзяржаўнымі займамі, павелічэннем падатковага ціску, правядзеннем грашовай рэформы і адменай картак на харчаванне і прамысловыя тавары. Таму ў Заходняй Беларусі жыхары звычайна цалкам залежалі ад сваёй гаспадаркі, агарода, рынку. Яны часта адчувалі сябе бяспраўнымі перад узброенымі людзьмі. Напрыкпад, у сітуацыйным рапарце АК за чэрвень 1945 г. паведамлялася пра аблавы з боку ўціхамірвальных батальёнаў, арміі і мясцовых груп садзейнічання. Для гэтага яны абкладалі вёску з раніцы і запужвалі людзей. Хапалі нават дзяўчат, якіх маглі аддаваць пад суд па прычыне ўхілення ад працы. Падчас аблаў салдаты рабавалі мясцовых жыхароў. Карныя акцыі дапаўняліся дзеяннямі прапагандысцкіх груп, калі, напрыклад, партыйныя органы накіроўвалі аген-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

та для збору подпісаў пад лістом да Сталіна ў падзяку за вызваленне ад нямецкай акупацыі і ўдзячнасць за апеку з боку СССР. Падпісаць павінен быў кожны пісьменны чалавек[6].

Пад прэсінг патрапілі тыя, хто быў да гэтага рэпрэсіраваны за "палітычныя злачынствы", а пазней – вызвалены. Як правіла, іх высылалі на пасяленне. Актыўна выкарыстоўваліся ў рэпрэсіўнай практыцы артыкулы 63–76 Крымінальнага кодэксу БССР (у першую чаргу – шпіянаж, прапаганда і агітацыя супраць савецкай улады, удзел у антысавецкіх арганізацыях).

Пры правядзенні калектывізацыі дзейнічаў ужо адпрацаваны механізм. Калі сяляне адмаўляліся ўступаць у калгас, ім замянялі зямлю на горшую і меншую, калі ўсё адно яны не ішлі, – павышалі падаткі ці пагражалі высылкай, не выдавалі пашпартоў, яны не маглі вучыцца ў ВНУ[7].

Для ўлады ўсё, што адбывалася падчас вайны, пад акупацыяй, было незаконным (набыццё маёмасці, вырошчванне ўраджаю на калгасных землях і г. д.). Органы МУС, якія не маглі справіцца з вялікімі злачынствамі, выкарыстоўвалі для справаздач нават нязначныя правіннасці, здзяйсняемыя жанчынамі і дзецьмі з-за голаду і нястачы. Прадстаўнікі ўлады маглі любога селяніна "памылкова" запісаць у кулакі, а пасля спецыяльна зацягваць разгляд скаргаў. Тых, хто не працаваў на калгас, маглі выселіць як паразітычны элемент.

Часу, вызначанага для эвакуацыі, аказалася недастаткова, пра што сведчыць скпаданне 25.11.1945 у Варшаве пратакола аб працягу эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы, польскіх грамадзян з тэрыторыі БССР да 15 чэрвеня 1946 г., вызначэнні тэрміну рэгістрацыі для эвакуацыі да 15.01.1946[8].

Самі ўлады не мелі дакладнага ўяўлення пра тое, дзе праходзіць савецка-польская мяжа. З-за таго, што ў запісах аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні карысталіся не тапаграфічнай картай, а толькі матэрыяламі райвыканкомаў, былі недакладнасці ў дакументах, што пацвярджалася праверкамі – савецкія памежныя войскі не заўсёды ахоўвалі мяжу, вызначаную пагадненнем[9].

Пасля вайны ў СССР скпалася кепскае становішча з сельскай гаспадаркай, бо дзяржава дапамагала мала і ў гэтай галіне не хапала мужчын. У Заходняй Беларусі гэта стала адным з матываў імкнення часткі жыхароў з'ехаць у Польшчу. Асноўныя прычыны, якія вымушалі палякаў выязджаць з БССР, а беларусаў заставацца ў Польшчы, былі фактычна аднолькавымі: страх перад савецкай уладай і рэпрэсіямі з боку дзяржавы (асабліва да скіраваных прапольску: у сувязі з актыўнай дзейнасцю АК), прымусовая калектывізацыя, атэістычная палітыка, родныя сувязі з палякамі і інш. Вялікая роля рэлігійнага і сваяцкага фактараў прыводзіла да таго, што на выезд у Польшчу запісваліся сем'ямі, парафіямі.

Пасля афіцыйнага роспуску АК у 1945 г. па аддзелам гэтай арганізацыі быў дадзены загад аб эвакуацыі ў Польшчу. Людзі, якія знаходзіліся пад пагрозай выкрыцця, канспіратыўна ці з дапамогай зброі павінны былі на поўдні лініі Керзана перайсці мяжу і індывідуальна пасяліцца, захоўваючы асцярожнасць[10]. Выезд вялікай колькасці чалавек, прыхільных польскаму антысавецкаму падполлю, прывёў да паступовага яго паслаблення.

Каля сямі працэнтаў з тых, хто збіраўся да выезду, не змаглі пацвердзіць сваю нацыянальнасць[11]. Імкненне з'ехаць было настолькі моцным, што людзі, калі не жылі пры Польшчы, змянялі нелегальна прозвішчы, падраблялі дакументы і пераязджалі праз мяжу. Так, пад уплывам працэсаў абмену насельніцтвам, напрыкпад, у Воранаўскім раёне Гродзенскай вобласці запісалася на выезд палякаў больш, чым іх было афіцыйна (больш за 95 % ад агульнай колькасці жыхароў раёна). На пытанне: чаму не паляк, а запісваецца на выезд у Польшчу, адказвалі: "Баюся калгасаў, хачу жыць і пра-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

цаваць аднаасобна"[12]. Але адмова ў дазволе на выезд не заўсёды была звязана з папярэдне згаданай прычынай (непацвярджэнне польскай нацыянальнасці), але і з баязлівай рэакцыяй улад. Пасля вайны ў рэспубліцы склалася цяжкае становішча, а масавыя запісы на выезд маглі дрэнна паўплываць на існуючую нестабільную сітуацыю.

Улады, як маглі, супраціўляліся працэсам добраахвотнага выезду ў Польшчу – у пашпарты палякаў запісвалі іншыя нацыянальнасці, па розных прычынах не давалі дакументаў на выезд, напрыклад, жыхароў Мастоўскага раёна не выпускалі, пакуль не выканаюць план лесанарыхтовак за ўвесь год[13].

Штомесячныя рапарты АК паказваюць таксама занепакоенасць сітуацыяй, калі, па меркаванню яе прадстаўнікоў, быў атрыманы загад скласці спісы жыхароў, асобна палякаў і асобна беларусаў. Па іх палякам з'яўляўся той, хто нарадзіўся за лініяй Керзана, а іншыя лічыліся беларусамі. У сувязі з гэтым улады знішчалі дакументы, каб насельніцтва не магло даказаць сваю нацыянальнасць[14]. Такім чынам, маглі адмовіць у выездзе тысячам людзей.

У той жа час улады рэкамендавалі ад'язджаць духоўным асобам, бо ведалі іх уплыў у грамадстве і рыхтавалі наступ як на каталіцкую царкву, так і на праваслаўную. Чым бліжэй быў канец эвакуацыі, тым больш прымушалі выязджаць ксяндзоў. У 1945–1947 гг. выехалі з Заходняй Беларусі 304 духоўнікі[15]. Асабліва моцна закранулі працэсы эвакуацыі Гродзенскую, Брэсцкую і Баранавіцкую вобласці. Каб кампенсаваць выезд насельніцтва, туды (акрамя Брэсцкай), а таксама ў Гомельскую былі накіраваны перасяленцы з Польшчы[16].

Прыехалі ў БССР у першую чаргу прадстаўнікі партыйных, савецкіх, камсамольскіх органаў, грамадзяне, якія актыўна супрацоўнічалі з органамі савецкай улады ў 1939–1941 гг., а таксама пераважная большасць бядняцкіх гаспадарак. Сялян вызвалялі ад натуральных паставак, уплаты грашовых падаткаў і абавязковага страхавання на два гады (1948–1949 гг.). За кошт перасяленцаў у Польшчу ім выдзялялі зямельныя надзелы да 15 га і дамы. Апрача гэтага, урад БССР выдаў шэраг адмысловых пастаноў наконт ільгот для перасяленцаў з памежных вёсак на новае месца жыхарства. Паводле іх перасяленцам выплачвалася грашовая дапамога ў памеры 5 тыс. р., давалася пазыка ў 10 тыс. р. з тэрмінам выплаты – на працягу дзесяці гадоў, за адзін гектар пакінутага пасева ім выдавалі чатыры цэнтнеры збожжа[17]. Палякам жа, якія выязджалі з тэрыторыі БССР, абяцалі, што пры перасяленні яны змогуць атрымаць зямлю (у памерах, прадугледжаных законам, нават для тых, хто ў БССР яе не меў).

Складанасці ў савецкай улады БССР узніклі ў сувязі з тым, што патрабавалася адсяліць гаспадаркі з памежнай зоны (раўнацэнную зямлю фактычна не давалі), а таксама з-за гаспадарак, пакінутых тымі, хто з'ехаў у Польшчу, якія не пусцелі ў чаканні прыезду людзей з Польшчы, а актыўна прадаваліся, выкарыстоўваліся пад размяшчэнне войскаў і хат-чытален.

Савецкія агітатары спрабавалі вывозіць беларусаў з зямель, якія знаходзіліся на мяжы (май 1948 г.), але мясцовае насельніцтва па іншы бок мяжы супраціўлялася гэтым акцыям, бо баялася, што іх вывезуць далей на ўсход на пасяленне. Калі мяжа была канчаткова зачынена 25 траўня 1948 г., большасць памежных гаспадарак з вызначаных на перасяленне з тэрыторыі Польшчы засталіся на месцы (нават меўшы беззваротную дапамогу ад БССР у памеры 5 тыс. р.)[18].

Працэсы абмену насельніцтвам прывялі да негатыўных з'яў у культурнай палітыцы абедзвюх дзяржаў. Ад 1945 г. на Беласточчыне памяншаецца колькасць беларускіх школ (нягледзячы на тое, што 70 % беларускага насельніцтва засталося на польскай тэрыторыі і не пажадала выехаць у БССР). Хаця з зарэгістраваных на выезд з БССР у Польшчу выехала толькі



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

каля 43 %[19]. на беларускай тэрыторыі з 1949 г. ліквідаваліся польскія школы, забаранялася вывучэнне польскай мовы, не засталося часопісаў, газет на польскай мове.

У штомесячных справаздачах за 1946–1948 гг. памежных польскіх ваяводаў адзначалася, што беларусы не хацелі пакідаць тэрыторыю Польшчы. Мэты польскіх улад і дыверсійных атрадаў у дадзеным выпадку супадалі: і тыя і другія ўздзейнічалі на беларусаў, каб прымусіць іх з'ехаць ці змяніць сваю нацыянальнасць на польскую. Гэта прывяло да таго, што на тэрыторыі былых беларускіх зямель з 1948 г. фактычна не фіксуецца беларуская меншасць[20].

Насельніцтва, у большасці сялянскае, супраціўлялася перамяшчэнню ў сувязі з вялікай прывязанасцю да маёмасці, да сваякоў. Але фактар страху пераважаў, прымушаючы іх бегчы з зоны "штодзённай катастрофы" (так можна ахарактарызаваць тэрыторыю Заходняй Беларусі ў час правядзення карных аперацый па вынішчэнню антысавецкага падполля і арганізацыі калгасаў). У Польшчу пераехала больш людзей, чым адтуль – у БССР. Лічбы, звязаныя з колькасцю пераехаўшых, цяжка ўдакладняць, бо некаторыя перасяклі мяжу нелегальна.

Канчатковая дэмаркацыя савецка-польскай мяжы ў БССР у 1950 г. вырашала дзяржаўную прыналежнасць асобных вёсак, хутароў ці груп населеных пунктаў. У адных выпадках даводзілася скасоўваць цэлыя сельсаветы ў сувязі з перадачай большасці іх пасяленняў ПНР, у другіх – пераносіць цэнтры сельсаветаў далей ад дзяржаўнай мяжы, у трэціх – устанаўліваць новую адміністрацыйную прыналежнасць населеных пунктаў[21].

Уладам давялося змагацца з большай часткай насельніцтва: паляваць за былымі калабарантамі, антысаветчыкамі, якімі маглі быць нават тыя, хто спраўна не плаціў падаткі. Змена аператыўнай абстаноўкі ў БССР пасля разгрому асноўных сіл польскага антысавецкага падполля прывяла да замены чэкісцка-вайсковых аперацый агентурна-аператыўнай працай[22].

Нягледзячы на так званыя "высокія мэты", антысавецкае падполле з-за тэрарызавання насельніцтва (палякі распраўляліся з асобамі іншых нацыянальнасцей, украінцы маглі разглядаць моладзь прызыўнога ўзросту як дэзерціраў і абвяшчаць злачынцамі падлеткаў 12 гадоў) пастуپова страчвае падтрымку жыхароў. Серыя масавых вывазаў, пастаянныя арышты асоб, якія падазраваліся ў спрыянні "бандам", а таксама выезд соцень тысяч чалавек за мяжу, у Польшчу, згодна з праграмай эвакуацыі прывялі да памяншэння збройнай барацьбы, якая фактычна скончылася ў 1950-х гг.

[1] Гл.: Валаханович И.А. Антисоветское подполье на территории Беларуси в 1944–1953 гг. Мн., 2002. С. 66.

[2] Гл.: Административно-территориальное устройство БССР: Справ: В 2 т. Т. 2. 1944–1980. Мн., 1987. С. 15–16.

[3] Гл.: Вялікі А. Перасяленне беларускага насельніцтва з Брэсцкай вобласці ў Польшчу ў адпаведнасці з пагадненнем ад 9 верасня 1944 г. // Берасцейскі хранограф: Зб. навук. пр. Брэст, 1999. Вып. 2. С. 138.

[4] Гл.: НА РБ. Ф. 4. Воп. 20. Спр. 244. А. 113.

[5] Гл.: Кузнецов И. Беларусь в период тоталитаризма // Гісторыя Беларусі ў еўрапейскім кантэксце: Матэрыялы гіст. семінараў, якія адбыліся ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры ў 2001 г. Мн., 2002. С. 172.

[6] Гл.: NKWD o polskim podziemiu (1944–1948). Warszawa, 1997. S. 316.

[7] Гл.: Паўсядзённае жыццё ў Беларусі: 1945–1965. Конкурс для школьнікаў (98/99): Зб. матэрыялаў і конкурсных працаў. Мн., 1999. С. 188.

[8] Гл.: Административно-территориальное... Т. 2. С. 19–20.

[9] Гл.: Там жа. С. 21–22.

[10] Гл.: NKWD... S. 321.

[11] Гл.: Вялікі А., Языковіч Л. Перасяленьне беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і з тэрыторыі БССР у Польшчу // Кантакты і дыялогі. 1998. № 12. С. 28.

[12] Гл.: Цыт. па: Вялікі А.Ф. Змяненні ў нацыянальна-дэмаграфічнай сітуацыі заходніх абласцей Беларусі пасля падпісання дагавора 16 жніўня 1945 г. аб савецка-польскай дзяржаўнай граніцы // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць:



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Матэрыялы міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 17–18 верас. 1999 г. / Адк. рэд. П.І. Брыгадзін, У.Ф. Ладысеў. Мн., 2000. С. 265.

[13] Гл.: Вялікі А.Ф. Змяненні ў нацыянальна-дэмаграфічнай сітуацыі заходніх абласцей Беларусі пасля падпісання дагавора 16 жніўня 1945 г. аб савецка-польскай дзяржаўнай граніцы. С. 266.

[14] Гл.: NKWD... 1997. S. 316.

[15] Гл.: Hlebowicz A. Katolicyzm w panstwie sowieckim. 1944–1992. Gdansk, 1993. S. 79.

[16] Гл.: Вялікі А., Языковіч Л. Указ. тв. С. 29.

[17] Гл.: Сідлярэвіч А. Фармаваньне сучаснае беларуска-польскае мяжы ў дакумэнтах і вусных усламінах (1944–1950) // Спадчына. 2002. № 2–3. С. 45.

[18] Гл.: Там жа. С. 49–50.

[19] Гл.: Вялікі А., Языковіч Л. Указ. тв. С. 28.

[20] Гл.: Ks. Grzegorz Sosna. Sprawy narodowosciowe i wyzńaniowe па Białostocczyznie (1944–1948) w ocenie władz Rzeczypospolitej Polskiej. Wybor dokumentow. Ryboły, 1996. S. 28–88.

[21] Гл.: Административно-территориальное... С. 4.

[22] Гл.: Валаханович И.А. Указ. тв. Мн., 2002. С. 89.

Паступіў у рэдакцыю 10.06.2003.

***Ірына Сяргееўна Кашталян*** – аспірантка кафедры гісторыі Расіі. Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар В.І. Менькоўскі.

*Н.И. МИНИЦКИЙ*

## ИДЕАЛЫ И ПРАКТИКА АНТИЧНОЙ ДЕМОКРАТИИ: (СТРУКТУРНО-КОМПОЗИЦИОННЫЙ АНАЛИЗ ТЕКСТА РЕЧИ ПЕРИКЛА)*

Применение структурно-композиционного метода и основанной на нем интерпретации текста речи Перикла позволило дифференцировать лексику политического мышления греков времени Пелопоннесской войны, выделив в ней понятия идеализации, идеальной нормы и исторических реалий.

The use of the structure and composition method and the interpretation of the Perikle's speech based on this method made it possible to differentiate the lexis of the political thinking of the Greeks at the time of Peloponnese war by distinguishing in it such notions as idealization, ideal norm and historic reality.

Характеристика афинской демократии как правления большинства, содержащаяся в речи Перикла и переданная Фукидидом, имеется почти во всех учебниках по античной истории. Такой интерес обусловлен конкретной событийной стороной – историей Пелопоннесской войны, приведшей в конечном итоге к трагическим последствиям для греческой свободы. Кроме того, ученые останавливаются на тех аспектах демократии, которые их интересуют в связи с личными исследовательскими интересами и актуальными потребностями современного общества.

Так, Н.М. Тронский акцентирует внимание на «совместимости коллективной морали полиса с основанным на частной собственности “самодовлеющим состоянием индивида”»[1]. М.С. Корзун считает, что «исследование борьбы между гражданскими группировками проливает свет и на сущность афинской рабовладельческой демократии, в системе которой существовал антагонизм между рабами и рабовладельцами, между афинскими гражданами и союзниками, между крупными рабовладельцами и мелкими производителями»[2]. Л.П. Маринович выделяет в демократии такие признаки, как «сознательная ориентированность на привлечение к политике всех граждан, полная подотчетность всех органов управления народному собранию, абсолютный суверенитет экклесии, приоритет законов»[3].

Если руководствоваться принципом дополнительности, то каждая из оценок представляет собой выяснение как сущности самой демократии, так

* Фукидид. История. II, 34–46 // Античная демократия в свидетельствах современников / Изд. подгот. Л.П. Маринович, Г.А. Кошеленко. М., 1996. С. 179–185.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm